# “КАБ ЛЮБІЦЬ БЕЛАРУСЬ НАШУ МІЛУЮ…” ВЫХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

*М.І. Сянкевіч*

Сутнасць паняцця “нацыянальная самасвядомасць” змяшчае ў сабе любоў да Радзімы, да зямлі, дзе нарадзіўся і вырас, гонар за гістарычныя здзяйсненні народа, пашану да роднай мовы. Агульнапрызнана, што дзейсным фактарам патрыятычнага выхавання з’яўляецца нацыяннальная і сусветная мастацкая культура, у якой сканцэнтраваны багаты агульначалавечы і ўласна нацыянальны вопыт грамадства. Літаратура, як від мастацтва і форма грамадскай свядомасці ў гістарычнай перспектыве, не толькі вобразна адлюстроўвае жыццё народа, яго светаўспрыманне, гісторыка-культурныя асаблівасці, але і ўздзейнічае на духоўны свет асобы, фарміруе яе грамадзянскую пазіцыю і светапогляд. Менавіта таму ў лік асноўных задач урокаў літаратурнага чытання ў пачатковых класах – у адным радзе з інтэлектуальным, эстэтычным, маральным выхаваннем, творчым развіццём вучняў – праграма ставіць і патрыятычнае выхаванне. І рабіць гэта неабходна сродкамі самога прадмета ў працэсе аналізу эстэтычнага зместу твора, ні ў якім разе не ператвараючы мастацкі твор (як нярэдка можна назіраць у школе) у дадатак да выхаваўчай гутаркі, нуднага маралізатарства на тэму прачытанага.

Найперш трэба заўважыць, што выхоўваць патрыятычныя пачуцці на ўроках літаратурнага чытання здольны толькі настаўнік, які дасканала ведае нацыянальную класіку, добра арыентуецца ў сучасным творчым працэсе, адчувае гонар за беларускую літаратуру і здольны перадаць гэтае адчуванне дзецям. Такі настаўнік павінен быць перакананы, што беларуская літаратура – вялікая нацыянальная каштоўнасць і яна нічым не горшая за літаратуры іншых народаў свету. У гэтай сувязі цікава прыгадаць інтэрвью з міністрам культуры Рэспублікі Беларусь Паўлам Латушкам (надрукавана 23 жніўня 2010 года ў “Белгазеце”). “Мне б хацелася, – гаворыць міністр, – каб на вуліцах нашай краіны з’явіліся не толькі тыя банэры, якія рэкламуюць касметыку, але і тыя, якія рэкамендавалі б перачытаць Караткевіча. Трэба праводзіць інфармацыйную палітыку такім чынам, каб у свядомасці людзей з’явілася перакананне, што наша культура вельмі багатая, глыбокая, і калі мы, напрыклад, гаворым пра тое, што Багдановіч – гэта беларускі Лермантаў, мы насамрэч маем права даводзіць, што Лермантаў – гэта рускі Багдановіч. Трэба гаварыць пра тое, што мы – паўнаважкая частка еўрапейскай культуры”.

Вялікую ролю ў вырашэнні пытанняў патрыятычнага выхавання малодшых школьнікаў адыгрываюць тэматычныя раздзелы падручнікаў па літаратурным чытанні. Добра, што яны маюць выразныя, афарыстычныя назвы: у другім класе школ з рускай мовай навучання – “Не проста ў словы

я гуляю, на роднай мове размаўляю", "Што ў народзе скажуць, як у вузел звяжуць", у трэцім класе – "Мой родны кут! Як ты мне мілы", у чацвёртым – "Радзіма мая дарагая"… Творы, на матэрыяле якіх можна вырашаць праблемы патрыятычнага выхавання можна знайсці і ў другіх раздзелах. На нашу думку, аналіз *кожнага* твора, прапанаванага для вывучэння, варта весці такім чынам, каб выхоўваць гонар за беларускую літаратуру, за роднае слова, якое дапамагае пісьменніку выказаць самыя складаныя пачуцці.

Выхаванне пашаны да роднага слова – адзін з ключавых напрамкаў у выхаванні патрыятызму малодшых школьнікаў. Значнасць гэтага напрамку абумоўліваецца тым, што ў сучасным грамадстве беларуская мова ўсё радзей выступае як сродак камунікацыі. Фарміраванне моўнага светапогляду вучняў, выпрацоўка ў іх духоўных адносін да роднай мовы, заснаваных на разуменні яе значэння, на разуменні той небяспекі, што пагражае мове, выхаванне пачуцця адказнасці за вымаўленае слова – вось асноўныя напрамкі працы настаўніка па станаўленні нацыянальна свядомай моўнай асобы вучня.

З першых урокаў чытання па беларуску вучні павінны ўзбагаціць сваю памяць словамі-паняццямі, якія лягуць пасля ў падмурак нацыянальнай самасвядомасці вучня. У другім класе раздзелам пра Айчыну і яе мову адкрываецца падручнік «Беларусачка». Дзеці павінны трывала засвоіць наступныя паняцці: «Беларусь», «Радзіма», «Бацькаўшчына», «Айчына», «краіна», «беларусы», «беларуская мова», «любоў да Радзімы», «гарады і рэкі Беларусі», «знакамітыя людзі краіны». Малодшыя школьнікі вучацца спасцігаць значэнні слоў найперш у канкрэтным тэксце. «А ўсё гэта – і лес, і рэчка, і зямля, па якой ты ходзіш, і горад, у якім ты жывеш, і вёска, у якой жывуць твае бабуля і дзядуля, – усё гэта разам называецца адным словам – Радзіма. У яе і імя ёсць – Беларусь… Ну а людзі, якія жывуць у Беларусі, гэта значыць мы з табой, называюцца беларусамі» (А. Бадак). Дзеці практыкуюцца ва ўжыванні гэтых паняццяў у адказах на пытанні настаўніка. На ўроках па наступных раздзелах падручніка настаўнік павінен пазнаёміць сваіх выхаванцаў з такімі паняццямі, як «беларускія кнігі», «беларускія пісьменнікі», «помнікі прыроды Беларусі», «беларускія казкі, песні, калыханкі, гульні», «беларускі характар», «беларускія народныя святы»… У трэцім класе усе гэтыя словы паступова ўваходзяць у актыўны слоўнікавы запас вучняў. Дзеці выкарыстоўваюць іх і без адпаведнай кантэкстуальнай падтрымкі. У настаўніка ўзнікае магчымасць павесці сур'ёзную для гэтага ўзросту размову пра гісторыю Радзімы, чытаючы ўрывак з нарыса У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі». Пашырэнне паняццяў «Радзіма», «родная мова» і іншых адбываецца і ў наступны год навучання. Тут настаўнік можа сказаць і пра няпросты шлях мовы, і пра яе заступнікаў, і пра мову як найвышэйшую нацыянальную каштоўнасць.

Як вядома, прынцып пабудовы сучасных беларускіх чытанак сезонна-тэматычны і звесткі пра пісьменнікаў амаль не падаюцца зусім. Па

гэтай прычыне, распрацоўваючы планы ўрокаў, на якіх будуць вывучацца творы класікаў беларускай літаратуры, настаўнікі сутыкаюцца з неабходнасцю пазнаёміцца як мага паўней з біяграфіяй пісьменніка, успамінамі пра яго сучаснікаў. З усяго гэтага трэба вылучыць звесткі, якія цікавыя, даступныя дзецям, матываваныя зместам уключаных у праграму твораў. Так, на нашу думку, малодшых школьнікаў зацікавілі б асобныя выпадкі з адвакацкай практыкі народнага заступніка Францішка Багушэвіча, якога абвінавачвалі ў "хлапаманстве" нават родныя дзеці, а ён заўсёды заставаўся самім сабою; вучні не засталіся б абыякавымі да грамадзянскага подзвігу Максіма Багдановіча…

У настаўніка (хай даруюць мне складальнікі "Прыкладнага каляндарнага планавання") павінен быць уласны пункт гледжання адносна таго, ці варта разглядаць на ўроку твор, які не дабаўляе яскравых рыс у выяву нацыянальнага характару беларуса, у якім няма пачуцця гонару за родны край, за прадстаўнікоў нацыянальнай культуры… Была б такая магчымасць, у чытанкі для трэцяга ці чацвёртага класа мы абавязкова ўключылі б урыўкі з вядомага эсэ сучаснага беларускага пісьменніка Уладзіміра Арлова "Мой радавод да пятага калена": "Мелі тыя крывічы звычай: калі дасягаў у іх юнак паўналецця, мусіў ён, каб называцца мужчынам, пераплысці хуткую ды глыбокую раку, упаляваць тура ці мядзведзя, раскласці ў залеву вогнішча, а таксама распавесці суродзічам аб продках сваіх да пятага калена… калі ж не ведаў ён роду свайго, то падлягаў выгнанню, бо ўважалася, што род ягоны, а значыцца, зямля бацькоўская, яму не дарагія і можа ступіць ён на шлях здрады".

Творам, у якіх з асаблівай выразнасцю праследжваецца пазіцыя пісьменніка-патрыёта, павінна ўдзяляцца на ўроках літаратурнага чытання асаблівая ўвага. Тут трэба сказаць, што іншы раз настаўнікам пачатковых класаў не хапае звычайнага гістарычнага і філалагічнага досведу. Спашлемся на прыклад. У чацвёртым класе да нядаўняга часу вывучаўся верш Алеся Гаруна "Ты, мой брат, каго зваць Беларусам…" Ён пачынаецца радкамі:

Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовы сваёй не цурайся.
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся…

На працягу некалькіх гадоў студэнтам трэцяга курса стацыянара і настаўнікам, якія завочна атрымліваюць вышэйшую адукацыю мы задавалі пытанні: "Пра якую волю гаворыць паэт?", "Чаму ў "аграбленай" хаце?", "Кім аграбленай і калі?". На жаль, адказы заўсёды былі нездавальняючымі (аж да таго, што гаворка ідзе пра падзеі апошняй вайны). Усё становіцца на сваё месца, калі прачытаць поўны варыянт твора, напісанага ў 1910 годзе да чатырохлецця "Нашай Нівы", пазнаёміцца з біяграфіяй Алеся Гаруна. Без адпаведнай падрыхтоўкі настаўнік не зможа данесці да разумення вучняў вобразны змест

напісанага ў турме верша Якуба Коласа “Родныя вобразы”, верша Канстанцыі Буйло “Люблю наш край” і інш…

Такім чынам настаўнік, які выхоўвае патрыётаў, павінен пастаянна пашыраць свае веды як па філалагічных дысцыплінах, так і па гісторыі Беларусі, краязнаўству, этнапедагогіцы, а выхаванне павагі да нацыянальнай класікі – важная састаўная частка патрыятычнага выхавання ў пачатковай школе.

Нельга быць сапраўдным патрыётам, калі не абагаўляеш памятных месцаў роднага табе краю, калі без пашаны адносішся да людзей, якія ўславілі родную вёску, “перад якімі заўсёды павінна быць сорамна”. Займаючыся патрыятычным выхаваннем малодшых школьнікаў, настаўнік павінен рыхтаваць у тым ліку і улюбёных у родную зямлю даследчыкаў.

Для гэтага не патрэбна адметных навыкаў. Вучням гарадскіх школ настаўнік можна прапанаваць наступныя пытанні і заданні: “Дзе жывуць бацькі вашага таты і мамы?”, “На якой мове яны размаўляюць?”, “Раскажыце мне пра вёску, у якой адпачывалі летам”, “Як яна называецца?”, “Адкуль пайшла такая назва?”, “Якія прозвішчы маюць людзі, што жывуць у вёсцы?”, “Як называецца бліжняя рэчка, возера?”, “Якія казкі вы чулі ад сваёй бабулі?..” Трэба памятаць, што для вучняў пачатковых класаў радзіма – гэта найперш сям’я, дом, вёска, вуліца. І калі мы не навучым іх з любоўю адносіцца да таго, што побач, то і паняцці “наша Радзіма”, “Беларусь” надоўга, калі не на заўсёды, застануцца ў свядомасці дзяцей толькі гучным словам. У вучняў трэба фарміраваць веды аб родным краі і пачуццё прывязанасці да тых мясцін, дзе нарадзіліся і выраслі іх бацькі і дзяды, з якімі звязаны яркія эмацыянальныя ўражанні саміх дзяцей.

Захопленае прыгажосцю дзіця іншым разам імкнецца выказаць сваё захапленне роднай прыродай у вершах, казках. Таму сучасны настаўнік павінен дбаць таксама і пра тое, каб падтрымаць у яго жаданні тварыць. Выдатна, калі педагог сам спрабуе свае сілы ў літаратурнай творчасці.

Падагульняючы, яшчэ раз заўважым, што ўрокі літаратурнага чытання заключаюць у сабе вялікія магчымасці ў вырашэнні пытанняў патрыятычнага выхавання. Праз мастацкае слова ў малодшых школьнікаў фарміруецца нацыянальная свядомасць, пачуццё гонару за сваю Айчыну, захапленне прыродай і славутымі мясцінамі роднага краю. Іншымі словамі, выхоўваецца пачуццё адказнасці і адданасці сваёй Радзіме.